ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

29 сьнежня 1931 г. № 314 (1568)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Вышэй сьцяг марксысцка-ленінскага выхаваньня

Пытаньне бальшавіцкага выхаваньня заўжды зьяўлялася цэнтральным ва ўсёй гісторыі і рабоце ленінскага комсамолу. Няма сумненьня ў тым, што толькі на аснове павышэньня марксысцка-ленінскага выхаваньня комсамол дабіўся велізарнейшых дасягненьняў на дапамозе нашай партыі ў справе социялістычнага будаўніцтва.

Цяпер, калі комсамол стаў шматмільённай організацыяй, калі пролетарыят нашай краіны пасьпяхова канчвае трэці, рашаючы год і ўступае ў апошні, заключны год пяцігодкі, перад ленінскім комсамолам, які зьяўляецца ўдарнай брыгадай у соцыялістычным будаўніцтве вырастаюць яшчэ больш складаныя задачы і тым больш адказныя — сувязі з узмацненьнем клясавай барацьбы.

Наша організацыя яднае ў свае рады масу моладзі, якая не прайшла суровую школу рэволюцыйнай барацьбы. Наш абавязак—даць ёй бальшавіцкае выхаваньне, уключыць яе энэргію ў актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве.

У комуністычным выхаваньні комсамольцаў рашаючае значэньне мае ўсваеньне комсамольцамі гісторыі баявых традыцый бальшавіцкай партыі.

Гісторыя бальшавіцкай партыі, вывучэньне баявых традыцый бальшавізму павінны стаць цэнтральным зьвяном у політвыхаваньні комсамолу. Што, як не гісторыя бальшавіцкай партыі, можа даць лепшае разуменьне стратэгіі і тактыкі клясавай барацьбы для комсамольца? Пранізаць усю вучобу партыйнасьцю, змаганьнем супроць правых і „левых“ опортуністых тым больш неабходна, што ва ўмовах абвастраньня клясавай барацьбы ў нашай краіне клясавы вораг вядзе ўпартую барацьбу за моладзь. „Опортунізм імкнецца зараз пранікнуць у нашыя рады, прыкрываючыся, прымазваючыся, паўзаючы на бруху, імкнецца пранікнуць у шчыліны і ў асаблівасьці імкнецца пралезьці праз вароты гісторыі нашай партыі“ (Кагановіч).

Ліст т. Сталіна ў рэдакцыю часопісу „Пролетарская рэволюцыя“ —„Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму“—мобілізуе ўвагу партыйных і комсамольскіх організацый на барацьбу з замаскаванымі формамі контррэволюцыйнага трацкізму і опортуністых усіх колераў, што выступаюць супроць партыі, супроць яе генеральнай лініі. Гэты ліст патрабуе ад кожнага партыйца і комсамольца павысіць сваю клясавую пільнасьць у барацьбе з антыленінскімі тэорыямі і ўстаноўкамі, у барацьбе з трацкісцкай контрабандай. Ліст т. Сталіна рашуча выкрывае гнілы лібэралізм, які мае „сярод аднэй часткі бальшавікоў некаторае распаўсюджаньне“, прымірэнчыя адносіны да трацкісцкіх контрабандыстых, што імкнуцца пад відам „распрацоўкі ленінізму“ і г. д. працягнуць свае „тэорыі“.

Гісторыя нашай бальшавіцкай партыі мае вялікае значэньне ў выхаваньні бальшавіцкіх кадраў ня толькі ў нашай краіне, але па-за межамі.

Зразумець па-сапраўднаму сёньнешнюю політыку бальшавізму можна толькі ў сувязі з тэй політыкай, якую бальшавікі ажыцьцяўлялі на працягу ўсей гісторыі сваёй барацьбы. Вось чаму трацкізм зараз зьяўляецца перадавым атрадам сусьветнай контррэволюцыі, скарыстоўвае ўсё для таго, каб сказіць ролю бальшавізму ў сусьветным пролетарскім руху, прадставіць бальшавізм толькі як „нацыянальна“ абмежаваную тэорыю, сказіць ленінскую тэорыю аб пролетарскай рэволюцыі, узьвесьці трацкісцкі паклёп аб „пераўзброеньні“ бальшавікоў у 1917 годзе.

Ліст т. Сталіна садзейнічаў ускрыцьцю цэлага раду антыленінскіх скажэньняў ня толькі па гісторыі нашай партыі, але і па другіх вучастках тэорэтычнага фронту і ў нас на Беларусі (трацкісцкі котрабандысты Югаў, антыленінскія памылкі Поташа, Сэрбэнты, Майзэля, Шапавалава і інш.). Менавіта на рашучую барацьбу супроць усялякіх скажэньняў ленінізму мобілізуе партыйную і комсамольскую організацыю рэзолюцыя Менскага актыву КП(б)Б.

У справе комуністычнага інтэрнацыянальнага выхаваньня ўсяго комсамолу мае вялікае значэньне вывучэньне і правядзеньне ў жыцьцё правільнай ленінскай нацыянальнай політыкі. Мы маем актывізацыю ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шовінізму гэтай галоўнай небясьпекі—як у тэорыі (Вольфсон, Выдра), так і на практыцы („Комунар“ — вялікадзяржаўна-антысэміцкае выступленьне Піткевіча), а так сама і ў бок мясцовага нацыяналізму (кніга Шчэрбакова і інш.).

Комсамольская організацыя павінна ўзмацніць сваю барацьбу за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі партыі, поўнасьцю выканаць пастанову ЦК КП(б)Б і ЦКК па нацыянальнаму пытаньню.

Напісаныя гора-тэорэтыкамі Олікерам і Розэнблюмам „Нарысы па гісторыі ЛКСМБ“ нічога агульнага з сапраўднай гісторыяй ЛКСМБ ня маюць. Олікер і Розэнблюм у сваіх нарысах па гісторыі займаюцца ідэалізацыяй люксэмбургіянства, Бунду, яны працягваюць антыпартыйныя авангардысцкія тэорыі. Разьвіцьцё ЛКСМБ прадстаўлена ў іх адарвана ад барацьбы і разьвіцьця ўсяго УсеЛКСМ. Яны зусім ігнорую вірую роль нашай партыі ў організацыі і разьвіцьці ЛКСМ. Неабходна рашуча ўдарыць па ўсіх гэтых авангардысцкіх трацкісцкіх тэорыях і ўстаноўках, якія скажаюць сапраўдны характар комуністычнага юнацкага руху.

Ліст тав. Сталіна павінен быць абгавораны на ўсіх ячэйках комсамолу і ў політгуртках. Гэта паглыбіць работу комсамолу ў вывучэньні гісторыі нашай партыі, увяжа гэтае вывучэньне з сёньнешняй барацьбой за пабудову соцыялізму.

Учора мы апублікавалі ўмовы спаборніцтва паміж ЛКСМБ і КСМ організацыі Заходняй вобласьці на лепшае правядзеньне агляду марксысцка-ленінскай вучобы, які быў абвешчаны сормавічамі.

Гэты агляд і спаборніцтва маюць сваёй задачай праверыць стан політычнай вучобы і зьнішчыць усе недахопы ў гэтай рабоце. Комсамольскія організацыі абавязаны зараз-жа падрыхтавацца да агляду. Конкрэтна ахапіць усіх комсамольцаў, у першую чаргу навічкоў і актыў, вучобай, зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі пропагандысцкіх кадраў.

Спаборніцтва паміж ЛКСМБ і комсамоліяй Заходняй вобласьці павінна паслужыць магутнаю зброяй сапраўднай бальшавіцкай пастаноўкі марксысцка-ленінскага выхаваньня і ўзьняць яго на ўзровень задач нашай гэроічнай эпохі.

За рашучую барацьбу супроць контррэволюцыйнага трацкізму, трацкісцкіх контрабандыстых, гнілога лібэралізму

Галоўная задача тэорэтычнага фронту—перабудова свэй работы на аснове ліста тав. Сталіна

Рэзолюцыя сходу актыву Менскай організацыі КП(б)Б па дакладу тав. Гея аб лісьце т. Сталіна ў рэдакцыю часопісу «Пролетарская рэволюцыя“ і задачах барацьбы за партыйнасьць у тэорыі

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), у жорсткай клясавай барацьбе, даючы бязьлітасны адпор правым і „левым“ опортуністым і прымірэнцтву да іх, партыя дабілася буйнейшых сусьветна-гістарычных перамог на шляху разгорнутага па ўсім фронце соцыялістычнага наступленьня—пасьпяхова завяршыла пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Уступілі ў строй новыя магутныя гіганты соцыялістычнай індустрыі —новы „АМО“, Харкаўскі трактарны завод, заканчваецца Магнітабуд, Кузьнецкабуд і г. д.

У БССР, як непарыўнай частцы ўсяго Савецкага Саюзу, шпарка растуць новыя буйныя фабрыкі і заводы (Гомсельмаш, Сталінбуд, Крычаўскі цэмэнтны завод і інш.), што павялічвае рады пролетарыяту і яшчэ больш узьнімае вядучую ролю соцыялістычнай прамысловасьці ў народнай гаспадарцы нашай рэспублікі.

СССР зьяўляецца краінай самага буйнага ў сьвеце земляробства. Продукцыя саўгасаў і колгасаў стала пераважнай. У барацьбе за цэнтральную задачу ў колгасным будаўніцтве— організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, у барацьбе за выкананьне 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна мы атрымліваем новыя перамогі ў справе соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Бальшавіцкае выкананьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна ўжо стварыла карэнны пералом у вугольнай і мэталюргічнай прамысловасьці і забясьпечвае перамогу на астатніх вучастках соцыялістычнай будоўлі.

Значна палепшаецца матар'яльнае і культурна-бытавое абслугоўваньне рабочае клясы, колгасьнікаў і працоўных мас.

Карэнным чынам зьмяніліся суадносіны клясавых сіл у краіне. Значна ўзрасла колькасьць рабочае клясы, павялічваюцца рады энтузіястых соцыялістычнай працы—ударнікаў. Колгасьнік стаў цэнтральнай фігурай земляробства, асноўнай і моцнай апорай савецкае ўлады на вёсцы. На базе суцэльнай колектывізацыі ліквідуецца апошні капіталізму ў нашай краіне—кулацтва, як кляса.

Ленінскае пытаньне „Хто каго?“ канчаткова вырашана ў карысьць соцыялізму.

Клясавы вораг, якога мы выбіваем з апошніх позіцый, упарта супраціўляецца разгорнутаму па ўсіх франтох нераможнаму наступленьню соцыялізму.

Агентура клясавага ворага ў радох партыі—правыя і „левыя“ опортуністы—імкнуцца паслабіць жалезнае адзінства нашай партыі і тым самым сьцягнуць яе з ленінскага шляху, сарваць пабудову соцыялізму.

Бальшавізм вырас і загартаваўся ў бязьлітаснай барацьбе на два фронты—супроць усялякіх праяў опортунізму.

Бязьлітасная барацьба на два фронты—супроць правага опортунізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць „левых“ загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў, барацьба з рэцыдывамі контррэволюцыйнага трацкізму, з яго контрабандным працягваньнем, з праявамі гнілога лібэралізму— зьяўляецца асноўнай умовай пасьпяховасьці будаўніцтва соцыялізму.

Фронт тэорэтычнай барацьбы зьяўляецца адным з важнейшых вучасткаў клясавай барацьбы. Барацьба з усялякага роду опортунізмам на тэорэтычным фронце на сучасным этапе нашага разьвіцьця набывае буйнейшае актуальнае значэньне.

Партыя разграміла клясава-варожыя тэорыі і „тэорыйкі“ на ідэолёгічным фронце (рубіншчына—у політ-экономіі, дэборыншчына—у філёзофіі, пераверзеўшчына і вароншчына —у літаратуры, мэханіцызм і г. д.).

Барацьба на ідэолёгічным фронце за марксысцка-ленінскую тэорыю, матэрыялістычную дыялектыку, супроць мэханіцызму, які зьяўляецца тэорэтычнай базай правага ўхілу, супроць меншавіцтвуючага ідэалізму, які ў асноўным зьяўляецца тэорэтычнай базай соцыял-фашызму і контррэволюцыйнага трацкізму— першачарговая задача ўсёй парторганізацыі, кожнага комуніста ў паасобку.

Агульнагарадзкі сход партактыву горача вітае сваячасовае выступленьне правадыра партыі тав. Сталіна ў часопісу „Пролетарская рэволюцыя“, якое мобілізуе ўсю партыю на непрымірымую барацьбу з працягваньнем контр-рэволюцыйнай троцкісцкай кантрабанды, з праявамі гнілога лібэралізму, з усялякага роду скажэньнямі марксызму-ленінізму.

Сход актыву падкрэсьлівае, што ліст тав. Сталіна мае велізарнейшае тэорэтычнае і політычнае значэньне для ўсяго тэорэтычнага фронту, усёй партыі і ўсяго міжнароднага рэволюцыйнага руху.

Ліст тав. Сталіна з усёй рашучасьцю і бальшавіцкай непрымірымасьцю выкрывае спробы рэвізаваць марксызму-ленінізму прадставіць паўцэнтрысцкі сьцяг люксембургіянства“, як сапраўднае марксысцкае вучэньне і, выкарыстоўваючы рэволюцыйныя заслугі Розы Люксэмбург, адцягнуць масы пролетарыяту на Захадзе ад бальшавіцкага кіраўніцтва Комінтэрну, ад пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва СССР.

Ліст тав. Сталіна рашуча патрабуе ад кожнага бальшавіка сугуба прынцыповых партыйных адносін да ўсіх тэорэтычных пытаньняў і перш за ўсё да пытаньняў гісторыі бальшавізму. Адгэтуль увага ўсёй партыі і тэорэтычных кадраў павінна быць сконцэнтравана на бальшавіцкай пільнасьці і барацьбе з гнілым лібэралізмам, які скарыстоўваецца трацкісцкімі контрабандыстымі дзеля сваіх контр-рэволюцыйных мэт.

Трацкістыя прабуюць весьці барацьбу супроць бальшавізму-ленінізму шляхам фальсыфікацыі гісторыі бальшавізму, шляхам адмаўленьня сусьветнай ролі бальшавізму, яго кіраўніцтва міжнароднай пролетарскай рэволюцыяй і непрымірымай барацьбы яго з усімі відамі опортунізму і прымірэнцтва—на працягу ўсяго існаваньня бальшавіцкае партыі.

Парт-актыў з усёй сілай падкрэсьлівае, што „трацкізм зьяўляецца перадавым атрадам контр-рэволюцыйнай буржуазіі“... Вось чаму лібэралізм у адносінах да трацкізму, хоць і разьбітага і замаскаванага, ёсьць галавацяпства, якое мяжуе са злачынствам, са здрадай рабочай клясе“ (Сталін).

Парт-актыў патрабуе ад усіх парт-організацый, ад кожнага комуністага ў паасобку ўзмацніць бязьлітасную барацьбу за партыйнасьць у рабоце, рашуча ўскрыць усялякія праявы контр-рэволюцыйнага трацкізму і яго контрабанды, усе памылкі, якія льлюць ваду на млын трацкізму, ускрываць і змагацца з усялякімі скажэньнямі ленінізму як у тэорыі, так і на практыцы. Узмацніць бальшавіцкую пільнасьць і змаганьне з гнілым лібэралізмам.

Актыў лічыць, што галоўнай задачай усяго тэорэтычнага фронту зьяўляецца рашучая перабудова сваёй работы на аснове ўказаньняў тав Сталіна.

Агульна-гарадзкі сход парт-актыву асабліва падкрэсьлівае, што ў БССР яшчэ да гэтага часу амаль няма літаратуры і падручнікаў па гісторыі КП(б)Б, якія-б правільна асьвятлялі гісторыю бальшавізму і Кастрычніцкай рэволюцыі на Беларусі. Да гэтага часу яшчэ працягваюцца ў літаратуру контррэволюцыйная трацкісцкая контрабанда, вялікадзяржаўніцкія, нацдэмаўскія тэорыі (напрыклад: аб 2 карэннасьці КП(б)Б, аб Кастрычніцкай рэволюцыі на Беларусі, як рэволюцыі сялянскай, ідэалізацыя дробна-буржуазных нацыяналістычных партый—Бунд, БСГ і г. д.), тлумачэньне ўсяго дарэволюцыйнага нацыянальнага руху, як контррэволюцыйнага і г. д. Кнігі, якія ёсьць па гісторыі КП(б)Б і Кастрычніцкай рэволюцыі, маюць рад буйнейшых як троцкісцкіх, так і вялікадзяржаўных і нацдэмаўскіх установак (работы—Агурскага, Поташа, Майзеля-Шапавалава, Шчарбакова і інш.).

Агульна-гарадзкі сход парт-актыву констатуе, што Югаў у сваіх работах за 1927 г. і назад у 1931 г. контрабандай працягваў контр - рэволюцыйныя трацкісцкія тэорыі, якія цалкам і поўнасьцю зьвязаны з яго прыналежнасьцю ў мінулым да трацкісцкай опозыцыі, такім чынам па сутнасьці Югаў займаўся двурушніцтвам. Сход партыйнага актыву лічыць немагчымым далейшае знаходжаньне гэтага контрабандыстага трацкізму і двурушніка ў радох нашай бальшавіцкай партыі.

Сход партыйнага актыву констатуе, што таварышы Вельфсон і Выдра у сваіх работах па крытыцы беларускага контрэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму выходзілі з позыцый вялікадзяржаўнага ўхілу.

Супроцьпастаўленьне нацыянальнай формы культуры яе пролетарскому зьместу, змазваньне контррэволюцыйнай сутнасьці нацыянал-дэмократызму, пагардлівыя адносіны да цэлага раду „дробных“ асаблівасьцяй нацыянальнай формы— вось зьмест гэтай вялікадзяржаўніцкай вылазкі т. т. Вельфсона і Выдры супроць лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Сход парт-актыву азначае, што тав. Шчарбакоў у кніжцы „Кастрычніцкая рэволюцыя на Беларусі і бела-панская акупацыя“ дапусьціў рад памылак беларуска-шовіністычнага характару.

Тав. Шчарбакоў змазвае кіруючую ролю пролетарыяту і яго авангарду — комуністычнай партыі ў Кастрычніцкай рэволюцыі. Тав. Шчарбакоў узводзіць нячуваны паклёп на комуністычную партыю, абвінавачваючы яе ў тым, што нібы КП(б)Б ня ставіла перад сабой задачу вырашыць нацыянальнае пытаньне.

Сход партактыву констатуе, што Гістпарт і яго асобныя працаўнікі (т. Сэрбэнта і інш) праявілі некрытычны падыход, недастатковую бальшавіцкую пільнасьць і гнілы лібэралізм пры выданьні навуковых прац, у першую чаргу пры выданьні заўваг да беларускага перакладу твораў т. Леніна.

Сход парт-актыву адзначае буйнейшую політычную памылку рэдакцыі польскай газэты „Орка“, якая да гэтага часу ігнаравала ўсё політычнае значэньне ліста тав. Сталіна, не разгарнуўшы вакол яго адпаведнай політычнай кампаніі і нават не зьмясьціўшы па гэтаму пытаньню ні аднэй заметкі.

Актыў патрабуе ад рэдакцыі газэты „Орка“ безадкладна выкрыць і выправіць гэты ганебны політычны скарыў.

Агульна-гарадзкі сход парт-актыву адзначае рад грубых прынцыповых і гістарычных памылак ў падручніку гісторыі УсеКП(б), якія прызнаны і асуджаны рэдактарам гэтага падручніку тав. Яраслаўскім.

(Канец гл. на 3-й стар.)

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1932 год

З дакладу старшыні СНК СССР тав. Молатава на другой сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР*

3. Пяцігодка транспорту

Некалькі адстае выкананьне пяцігодкі па транспарце. Тут за першыя тры гады пяцігодкі ёсьць невыкананыя рады заданьняў.

У 1932 годзе намячаецца значна шырэйшы размах рэканструкцыйных работ. Побач з увядзеньнем магутных паравозаў, якое пачынаецца ў гэтым годзе, вялікіх узных вагонаў, а таксама электравозаў, цеплавозаў і аўтосцэпкі—вялікае значэньне для ўзьняцьця транспарту будзе мець правядзеньне тых, як часам гавораць „дробных" работ, ад якіх залежыць неадкладнае палепшаньне работы чыгуначнага транспарту на радзе важнейшых вучасткаў.

На капітальнае будаўніцтва па чыгуначным, водным, дарожным і паветраным транспарце на 1932 год адпускаецца 3 330 млн. руб. Пры гэтым на чыгуначным транспарце работы концэнтруюцца на разьвіцьці ліній Масква—Данбас, выхаду з Данбасу і ліній Масква—Магнітагорск—Кузьнецк.

4. Пяцігодка па працы і быце працоўных

У становішчы працоўных мас СССР мы будзем мець значна большыя дасягненьні за 4 гады, чым гэта прадугледжвалася ўсёй пяцігодкай. На пяты год пяцігодкі лік рабочых і служачых намячаўся ў 15,8 міл., але ўжо к канцу мінулага году мы па 3 мільёны больш рабочых і служачых, лік якіх дасягае 18,7 мільёна. Кантрольныя лічбы 1932 году прадугледжваюць далейшы рост ліку рабочых і служачых да 21 мільёна, што азначае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады ў размеры каля 133 проц. У самой прамысловасьці на апошні год пяцігодкі намячалася 4 мільёны рабочых: між тым, ужо за канец трэцяга году пяцігодкі мы мелі 5,4 мільёна. У чацьвертым годзе пяцігодкі лік рабочых дасягае 6,5 мільёна, значыць у адносінах непасрэдна індустрыяльных кадраў мы выконваем пяцігодку на 52 проц. Гэта азначае, што на машынай соцыяльная аснова СССР—рабочая кляса—шпарка расьце, а кожным годам павышаецца удзельная вага рабочай клясы ва ўсім жыцьці нашай краіны.

На апошні год пяцігодкі ўвесь фонд заработнай платы акрэсьліўся ў 15,7 мільярдаў рублёў. Фактычна ўжо ў трэцім годзе гэты фонд дасягнуў 21,7 мільярда. Плянам 1932 году фонд заработнай платы узьнімаецца да 26,5 мярд. руб. Значыць, пяцігодка па фондзе заработнай платы выконваецца за чатыры гады ў размеры 171 проц. Лічбы гавораць самі за сябе.

Бюджэт соцыяльнага страхаваньня на апошні год пяцігодкі намячаўся ў 1.850 млн. руб. Фактычна ўжо ў мінулым годзе ён дасягнуў 2.500 млн. руб., г. зн. мы ўжо на трэцім годзе пяцігодкі значна перавыканалі пяцігодку па соцыяльнаму страхаваньню. На наступны год бюджэт соцыяльнага страхаваньня дасягне 3 940 млн. руб., г. зн. ў чацьверты год пяцігодкі ён амаль падвоены супроць апошняга году ў пяцігадовым пляне.

Пяцігадовым плянам прадугледжвалася правядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня ў апошнім годзе пяцігодкі. На справе мы ідзем значна шырэй намечанай пяцігодкі і ўжо на чацьвертым годзе пяцігодкі заканчваецца правядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня ва ўсёй прамысловасьці.

Нарэшце, аб жыльлёва-комунальнай гаспадарцы. У мінулым годзе ў гэтай справе пачаўся рашучы зрух, перш за ўсё ў сталіцы СССР—у Маскве. Як вядома, побач з Масквой у наступным годзе на вялікую вышыню ставяцца работы па комунальнаму будаўніцтву ў Ленінградзе, а таксама ў некаторых іншых гарадох. Нашай задачай зьяўляецца ажыцьцяўленьне на справе намечаных програм работ і падрыхтаваньне шырокага разгортваньня ўсёй жыльлёва-комунальнай справы ў СССР.

5. Аб агульных выніках і водгалах пяцігодкі

У выніку вялізарнага гаспадарчага ўзьдыму мы маем шпаркі рост усяго народнага даходу ў СССР. Карэннае адрозьненьне краіны соцыялістычнага будаўніцтва ад усяго астатняга сьвету падкрэсьлена цэлым шэрагам фактаў, пры ўсім паказаньні падзеньня народнага даходу ў капіталістычных краінах у сувязі з крызісам, вялізарны рост народнага даходу ў СССР знаходзіць свой адбітак у дасягненьні на 4-м годзе пяцігодкі супроць запланаваных узроўняў, якія намячаліся для апошняга году пяцігодкі, а менавіта: народны даход у СССР у 1932 г. павінен перавысіць 49 мярд. руб. Гэта будзе азначаць разам з тым, што удзельная вага соцыялістычнага сэктару ў народным даходзе перавысіць 90 проц. супроць 71 проц. у пяцігадовым пляне.

Застаецца сказаць два словы аб дзяржаўным бюджэце. Сэсія ЦВК заслухае спэцыяльны даклад па гэтаму пытаньню, і таму я тут зусім коратка адзначу вынікі. Пяцігодка прадугледжвала, што сума дзяржбюджэту ў СССР за ўсе пяць год складзе 53,8 мярд. руб. Фактычна-ж ужо за тры гады пяцігодкі сума дзяржбюджэту складае звыш 45 мярд. руб. Калі да гэтага далучыць дзяржбюджэт 1932 г., а імянна 27,4 мярд. руб. плюс 3,1 мярд. руб. эксплёатацыйных выдаткаў па транспарце (што ў пяцігодачным пляне уключалася ў дзяржбюджэт), дык у адносінах дзяржбюджэту мы ўжо за 4 гады выконваем заданьні пяцігодкі на 146 проц. (78,6 мярд. руб. за 4 гады супроць 58,8 мярд. руб., прадугледжаных пяцігодкай на ўсе пяць год).

III. Задачы моманту

Што трэба рабіць, каб ажыцьцявіць задачы 1932 г., каб завяршыць пяцігодку за чатыры гады?

Можна коратка адказаць на гэта пытаньне—узьняць продукцыйнасьць працы на нашых фабрыках і заводах, у капальнях і на чыгунках, у саўгасах і колгасах. Ленін многа раз указваў на тое, што продукцыйнасьць працы ў канчатковым выніку вырашае пытаньне аб перамозе новага грамадзкага ладу. Аб гэтым у даны момант прыходзіцца асабліва напомніць з прычыны незадавальняючых у гэтых адносінах вынікаў мінулага году.

У 1931 г. продукцыйнасьць працы ў прамысловасьці ўзьнялася на 6,6 проц. А гэта зусім невыстарчальна і значна адстае ад прынятай програмы. У шэрагу выпадкаў мы ня маем устаноўленага зьніжэньня сабекошту, але маем, наадварот, рост сабекошту ў вытворчасьці і будаўніцтве. З гэтым становішчам нельга мірыцца. У 1932 г. мы павінны разгарнуць [illegible] ўзьняцьце продукцыйнасьці працы ў нашай прамысловасьці, у сельскай гаспадарцы і на транспарце. Тым больш, што намі ўсё робіцца для таго, каб не дапусьціць паўтарэньня фактаў мінулага году на транспарце, які сарваў у значнай меры дасягненьні прамысловасьці. Усё гэта патрабуе разгорнутай барацьбы за радыкальнае паляпшэньне ў справе арганізацыі працы і кіраваньня.

У сувязі з гэтым, трэба спыніцца на наступных асноўных задачах моманту:

а) Пытаньні арганізацыі працы. Гэтыя пытаньні ў мінулым годзе ўжо былі пастаўлены партыяй ва ўсёй вастрыні, і сапраўды зьяўляюцца асноўнымі пытаньнямі працы для ўсіх нашых гаспадарчых органаў. Сюды адносіцца перш за ўсё барацьба з абязьлічкай і ўраўнілаўкай у зарплаце, а таксама пераход ад самацёку да арганізаванага набору рабсілы.

З найбольшай яркасьцю вынікі абязьлічкі выявіліся на чыгуначным транспорце.

Ліквідацыя абязьлічкі паравозаў адразу-ж станоўча адбілася на ўсёй паравознай гаспадарцы НКШЗ. Пасьля ліквідацыі абязьлічкі зьніз ўся процант хворых паравозаў. Значна зьнізілася псаваньне паравозаў у дарозе, зьменшыліся выпадкі непадачы паравозаў пад цягнікі і г. д. Пераход ад абязьлічкі да спаранай язды на паравозах і зьвязанае з гэтым устанаўленьне выразнай адказнасьці машыніста за работу паравозаў дагэтуль яшчэ ня ўсюды ў належнай ступені праведзены на чыгувачным транспорце. А гэта павінна быць давядзена да канца.

Пытаньні організацыі працы і, перш за ўсё, пытаньні барацьбы з абязьлічкай і ўраўнілаўкай павінны стаяць у цэнтры ўвагі нашай прамысловасьці, соцыялістычнага земляробства, жывёлагадоўлі і транспорту.

б) Пытаньні організацыі працы ў колгасах павінны займаць асобнае месца. Указаньні партыі на ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі і тут павінны знайсьці сваё дастасаваньне. Аднак у колгасах ёсьць свае асаблівасьці, якіх няма у прадпрыемствах прамысловасьці, або скажам, у саўгасах.

На аснове вопыту мінулага году, калі колгасы ўжо дасягнулі абсалютнай перавагі у сельскай гаспадарцы, трэба праверыць, як ажыцьцяўляюцца на практыцы ўказаньні VI зьезду Саветаў аб размеркаваньні даходаў у залежнасьці ад колькасьці і якасьці працы колгасьніка і забясьпечыць узмацненьне матар'яльнай зацікаўленасьці колгасьніка ў выніках вытворчасьці, і разам з тым, умацаваньне колгасаў, як буйной соцыялістычнай гаспадаркі. Але асноўны вывад і без таго ясны. Без палепшаньня організацыі працы, або інакш кажучы без патрэбнага організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў нельга забясьпечыць росту колгасаў, як соцыялістычных форм гаспадаркі і выкананьня пастаўленых перад імі задач па скончэньню пяцігодкі за чатыры гады.

в) Разгортваньне таваразвароту. Пытаньні палепшаньня забясьпечаньня рабочых стаялі ў гэтым годзе ў ліку асноўных задач савецкай улады. Над гэтымі пытаньнямі працавала ўся партыя. Бясспрэчна пэўнае палепшаньне за гэты год было дасягнута. Павышэньне цэн на некаторыя тавары ні ў якай меры не адбілася на таваразвароце, наадварот, таваразварот значна ўзьняўся. Але на дасягнутых выніках ні ў якай меры супакоіцца нельга. У 1932 годзе фонд тавараў шырокага спажываньня значна ўзрастае. Гэты фонд узьнімаецца, калі лічыць па раздробных цэнах мінулага году, з 27,2 мільярда рублёў да 35,5 мільярдаў рублёў і. зн., раздробны зварот соцыялістычнага сэктару ўзрастае на 30 проц.

У мэтах разгортваньня прамысловасьці, якая выпрабляе прадметы шырокага спажываньня, у 1932 годзе намечан рад новых пабудоў. Прычым, націск робіцца на разгортваньне будаўніцтва у аддаленых ад цэнтру раёнах. Так, у Сярэдняй Азіі пастаноўлена прыступіць да пабудовы новага магутнага тэкстыльнага комбінату, маючы на ўвазе палепшаньне забясьпечаньня тканінамі насельніцтва Сярэдняй Азіі і Сібіру. Намечана вялікая програма разгортваньня будаўніцтва цукровых заводаў, прычым галоўная частка гэтых заводаў павінна быць пабудавана ў Казакстане і на Далёкім Усходзе.

Прынятая у 1931 годзе програма будаўніцтва мясных комбінатаў і консэрвных заводаў будзе разгорнута ў 1932 годзе. Усё гэта гаворыць аб узмоцненай увазе савецкай улады да палепшаньня забясьпечаньня рабочых і ўсёй масы працоўных.

г) Правядзеньне гаспадарчага разрахунку. У справе ўкараненьня гаспадарчага разрахунку за мінулы год зроблен вялікі крок наперад. Паколькі ад правядзеньня гаспадарчага разрахунку ва многім залежыць рост нашых накапленьняў і паколькі на многіх вучастках справа з гаспадарчым разрахункам стаіць усё яшчэ зусім нядобра, задача ўкараненьня гаспадарчага разрахунку стаіць перад намі з усёй вострыцьцю. Прынятымі папраўкамі да крэдытнай рэформы 1930 году створаны ўмовы для ўмацаваньня гаспадарчага разрахунку, для зьнішчэньня безгаспадарчасьці і ўзмацненьня мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці. Але асаблівае значэньне набывае практыка дагаворных адносін і з пункту погляду ўмацаваньня гаспадарчых пляну, якія намі прыймаюцца на аснове цьвёрдых узаемаадносін паміж гаспадарчымі організацыямі і з пункту погляду умацаваньня гаспадарчага разрахунку у нашых прадпрыемствах і гаспадарчых організацыях, дагаворы павінны заняць важнейшае месца у нашай рабоце ў наступным годзе. Як вядома нашы прынцыпы гаспадарчага разрахунку ні у якай меры не супярэчаць плянавай організацыі гаспадаркі. Наадварот, наш гаспадарчы разрахунак знаходзіцца ў злучнасьці і, больш таго, у падпарадкаванасьці да прынятага народна-гаспадарчага пляну.

З другога боку, укараненьне гаспадарчага разрахунку неабходна імена для таго, каб разьвіцьцём належнай адказнасьці і, разам з тым, ініцыятывы ў рабоце прадпрыемстваў і гаспадарчых органаў забясьпечыць выкананьне гаспадарчай програмы. Сыстэма дагаворных адносін зьяўляецца лепшым сродкам злучанасьці гаспадарчага пляну і прынцыпу гаспадарчага разрахунку і таму гэтай справе павінна быць аддана асаблівая ўвага ўсімі гаспадарчымі організацыямі.

У правядзеньні гаспадарчага разрахунку ёсьць ня мала скажэньняў. З аднаго боку, ня мала прыкладаў фармальна бюрократычных адносін да правядзеньня гаспадарчага разрахунку, якія на практыцы азначаюць адмаўленьне політыкі партыі ў гаспадарчым будаўніцтве. З другога—справа даходзіць да адкрыта буржуазных скажэньняў прынцыпаў гаспадарчага разрахунку. У гэтых адносінах характэрна практыка простага тавараабмену паміж гаспадарчымі організацыямі, якая вядзе да зрыву пляну і адбівае буржуазныя тэндэнцыі ў гаспадарчым апараце (захаваньне ад дзяржавы таварных рэсурсаў, марнатраўнасьць у іх расходваньні і інш.), на якую партыя ўказала ў сувязі з работай Саюзцукру, усё гэта гаворыць за безумоўную неабходнасьць укараненьня гаспадарчага разрахунку. Бяз цьвёрдага правядзеньня гаспадарчага разрахунку нельга ўзьняць унутрыпрамысловае накапленьне, нельга весьці сапраўднай барацьбы з безгаспадарчасьцю і, значыцца, нельга забясьпечыць выкананьне гіганцкай програмы наступнага году—скончэньне пяцігодкі за чатыры гады.

Практычная работа ўсіх савецкіх гаспадарчых органаў павінна быць пераведзена з рэек дэкрэтна-дырэктыўных пастаноў і распараджэньняў на рэйкі сыстэматычнай праверкі выкананьня на справе даных падпарадкаваным органам заданьняў. Перавод практычнай работы ўсіх нашых органаў з рэек дэкрэтна-дырэктыўных пастаноў і распараджэньняў на рэйкі сыстэматычнай праверкі выкананьня на справе даных падпарадкаваным органам заданьняў, павінен быць ажыцьцёўлен насьлядоўна па-бальшавіцку. За праверку выкананьня павінны ўзяцца самі кіраўнікі ўстаноў і гаспадарчых організацый. Нельга гэту справу перакладваць на другіх. Больш таго, імена ў ходзе праверкі фактычнага выкананьня і будзе па-сапраўднаму расьці наш гаспадарчы вопыт, наладжвацца сапраўднае гаспадарчае кіраўніцтва, забясьпечвацца на справе правядзеньне політыкі партыі. Нашым народна-гаспадарчым плянам даецца політычная устаноўка для усяго соцыялістычнага будаўніцтва.Ператварэньне у жыцьцё гэтай політычнай установкі залежыць перш за ўсё ад таго, якімі тэмпамі пойдзе наперад аўладаньне намі тэхнікай вытворчасьці і кіраўніцтва, уключаючы ў гэта пытаньні організацыі працы. А гэта ў сваю чаргу за многім залежыць ад таго, наколькі ўзьнімецца справа праверкі выкананьня. Наладжаньне праверкі выкананьня і забясьпечаньне конкрэтнага кіраўніцтва ёсьць на справе два бакі аднэй і тэй-жа справы. Таму ў апошні час і праводзяцца пэўныя організацыйныя перабудовы ў гаспадарчай галіне, як напрыклад, разбуйненьне гаспадарчых аб'яднаньняў.

IV. Аб міжнародным становішчы і барацьбе за мір

У цэлым у адносінах да СССР з капіталістычнымі краінамі за мінулы час не адбылося якіх-небудзь зьмен. З тымі дзяржавамі, з якімі Савецкі Саюз меў і раней нормальныя або прыязныя адносіны, у нас і зараз поўнасьцю захаваліся гэтыя адносіны. Савецкі ўрад робіць усё для таго, каб і далей умацаваць гэтыя адносіны на аснове моцна ўстаноўленых прынцыпаў савецкай політыкі. З тымі-ж дзяржавамі, з якімі мы ня лічылі нашы адносіны даволі здавальняючымі, савецкі ўрад імкнуўся забясьпечыць палепшаньне узаемаадносін. І гэта таксама цалкам адпавядае політыцы, якая нязьменна праводзілася савецкай уладай.

У апошні час нам зроблена прапанова аб заключэньні пакту аб ненападзе з боку Румыніі, Фінляндыі і Эстоніі. Мы лічым, што заключэньне пактаў аб ненападзе з гэтымі, як і з іншымі, і асабліва пагранічнымі з СССР краінамі цалкам адпавядае мірнай політыцы савецкай улады і інтарэсам забясьпечаньня ўсеагульнага міру. Як і раней мы імкнемся да таго, каб паставіць пытаньне аб перакладаньні гэтых пактаў аб ненападзе на рэйкі практычнага ажыцьцяўленьня. Усё, што залежыць у гэтых адносінах ад СССР, праводзіцца савецкім урадам.

Важнейшым для нашага замежнага становішча пытаньнем зьяўляюцца, вядома, падзеі на Далёкім Усходзе—падзеі ў Манчжурыі. Факты сьведчаць аб тым, што маштаб гэтых падзей ня толькі не скарачаецца, але мае яўную тэндэнцыю да далейшага і ўсё большага пашырэньня. Вядома, што Ліга нацый прабавала ўмешвацца ў ваенныя падзеі, якія адбываюцца у Манчжурыі, але гэта ўмешваньне ні ў якай меры не адбілася ў бок зьнішчэньня цяперашняй окупацыі Манчжурыі і спыненьня ваенных дзеяньняў. Вынікі гэтага ўмешваньня проста прошлеглыя. Два разы Ліга нацый прабавала выступіць з сякімі-такімі конкрэтнымі прапановамі з прычыны окупацыі Манчжурыі. Мы ведаем, да чаго гэта прывяло.

У пачатку падзей Ліга нацый назначыла нават нейкую дату, а імена 14 кастрычніка, з якой зьвязваліся ў колах ілюзіі наконт магчымасьці нейкага пералому да лепшага, г. зн. да згортваньня ваенных дзеяньняў у Манчжурыі. Але нічога падобнага не адбылася. Пасьля новага і вельмі доўгага абмеркаваньня Ліга нацый нядаўна разразілася рашэньнем аб пасылцы ад імя пяці дзяржаў у Манчжурыю... навукова-дасьледчай каміс. і, г. зн. давяла сваё поўнае нежаданьне і бясьсільле ў якой-бы там ні было меры перашкодзіць далейшаму разгортваньню ваенных падзей у Манчжурыі. Гэта другое рашэньне Лігі нацый зьяўляецца простым зьдзекам над яе-ж уласнай першай пастановай, а па сутнасьці асьвячае ваенную окупацыю і далейшае разгортваньне ваенных падзей у Манчжурыі.

Усё гэта прымушае нас узмацніць пільнасьць у адносінах падзей на Далёкім Усходзе. Мы ня можам забываць, што нашы граніцы ідуць уздоўж манчжурскай лініі. Мы не сумняваемся, што нашы далёка-ўсходнія гэроі будуць на вышыні становішча і будуць пільнымі ў адносінах да савецкіх граніц на Далёкім Усходзе (доўгія аплёдысмэнты).

Рабочыя і працоўныя масы вёскі Савецкага Саюзу заняты сваімі ўнутранымі справамі, яны захоплены задачамі ўздыму гаспадаркі, задачамі палепшаньня свайго жыцьця. Таго-ж яны жадаюць і рабочым іншых краін. Але падзеі міжнароднага жыцьця патрабуюць ад нас узмоцненай пільнасьці. І мы зноў падкрэсьліваем наш асноўны прынцып: чужой зямлі нам ня трэба, але і аднэй пядзі сваёй зямлі мы нікому ня ўступім (аплёдысмэнты).

Набліжаецца скліканьне камісіі па разброеньню. Вакол даты скліканьня гэтай камісіі—2 лютага 1932 году—цяпер ідзе немалая політычная гульня імпэрыялістычных урадаў. Інтарэсы якіх ня маюць нічога супольнага са справай разброеньня. Робяцца спробы адтэрмінаваць і наогул зьняць пытаньне з камісіі па разброеньню. Яшчэ больш, з боку пануючых імпэрыялістычных сіл робіцца ўсё для таго, каб камісію па разброеньню ператварыць у комэдыю, якая зусім не стварае ніякіх затрудненьняў для паноў імпэрыялістых у справе далейшых узброеньняў. Усё робіцца для таго, каб камісія па разброеньню не заняласся сваёй непасрэднай задачай і зусім не перашкаджала-б росту ўзброеньняў, асабліва мацнейшых імпэрыялістычных дзяржаў. Апошнія бачаць сэнс свайго ўдзелу ў гэтай справе толькі ў тым, каб, прыкрываючыся ўдзелам у камісіі па разброеньню, кінуць сабе зусім вольныя рукі ў павялічэньні сваіх узброеньняў і ў сколачваньні ваенна-політычных блёкаў для новых імпэрыялістычных войн.

Урэшце, прапановы імпэрыялістычных дзяржаў падобны адна да адной, іх сэнс—не разброеньне, а свабода дзеяньняў у далейшым росьце ўзброеньняў. Есьць толькі адна прапанова, накіраваная да сапраўднага разброеньня. Яна ўнесена СССР. Гэта прапанова заключаецца ў поўным фактычным разброеньні ўсіх краін. СССР застаецца на тым, што гэта ёсьць адзіная прапанова, якая служыць справе разброеньня, і ўсеагульнага міру. Як максімум мінімуму СССР прапанаваў на працягу бліжэйшага году правесьці, прынамсі, палавіннае скарачэньне ўзброеньняў. Але і гэта прапанова адхіляецца імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Ня гледзячы на гэта, савецкі ўрад застаецца на тым пункце гледжаньня, што ёсьць толькі адна програма разброеньня, якая зьяўляецца разам з тым програмай міру—програма поўнага разброеньня, прапанаваная СССР (аплёдысмэнты).

Побач з шуміхай вакол скліканьня камісіі па разброеньню павялічваецца колькасьць адзнак, якія сьведчаць аб узрастаючай небясьпецы ўсеагульнаму міру. Найглыбейшы экономічны крызіс абвастрае ўсё больш супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі і пагаршае іх унутранае становішча ў сілу абвастраньня клясавых супярэчнасьцяй. Экономічная барацьба, у сувязі з правядзеньнем тых усякіх разнавіднасьцяй протэкцыянізму і звышпротэкцыянізму, ператвараецца ўжо у сапраўдную экономічную вайну паміж паасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі. Яшчэ крок-другі і барацьба за рынкі пяройдзе ў імпэрыялістычную вайну. Небясьпека новых ваенных імпэрыялістычных авантур вялічваецца.

СССР асабліва павінен лічыцца з небясьпекаю імпэрыялістычнага нападу. Нам добра вядома, што ў некаторых дыплёматычных габінэтах у даны момант самым актыўным чынам абгаварваецца пытаньне аб ваенным нападзе на наш Саюз. Нельга забываць аб тым, што многія організатары ранейшых ваенных інтэрвэнцый супроць СССР яшчэ жывы і дзейнічаюць цяпер за адно з другімі, за адно з новымі прадстаўнікамі імпэрыялізму ў справе падрыхтоўкі нападу на рабочую рэспубліку.

У сувязі з падзеямі ў Манчжурыі выкрыта ў нашай і ў замежнай, у тым ліку і буржуазнай прэсе, ужо не адна провокацыйная спроба ўцягнуць СССР у вайну. Падпальшчыкі вайны з лягеру імпэрыялістых паспрабуюць яшчэ ня раз аб провокацыі з мэтай ўцягненьня СССР у вайну і організацыі ваеннага нападу на нашу дзяржаву. Мы павінны быць гатовы і да далей да гэтых провокацый.

Мы адказваем на ўсё гэта пасьлядоўным правядзеньнем політыкі міру. Мы адказваем на гэта павялічэньнем нашай пільнасьці. Мы адказваем на гэта ўзмацненьнем будаўніцтва і перш за ўсё тым, што змагаемся ўжо ў 1932 годзе за скончэньне пяцігодкі. У нашай краіне б'е крыніцай творчая работа, адбываецца гіганцкае будаўніцтва, пераможна будуецца соцыялізм. У гэтым мы бачым умацаваньне ня толькі нашых унутраных, але і міжнародных позыцый. Пераможным ажыцьцяўленьнем народна-гаспадарчага пляну, скончэньнем пяцігодкі за чатыры гады, разгорнутай па ўсім фронце барацьбой за справу соцыялізму адкажам нашым клясавым ворагам. Наша задача—умацаваньне справы ўсеагульнага міру і міжнароднага соцыялізму—забясьпечаньне перамогі рабочае клясы. (Доўгія аплёдысмэнты).

*) Канец. Пачатак гл. за ўчарашнім № „Ч."

№ 299 (1568)

...рашучую барацьбу супроць контррэволюцыйнага трацкізму, трацкісцкіх контрабандыстых, гнілога лібэралізму

...алоўная задача тэорэтычнага фронту—перабудова сваёй работы на аснове ліста тав. Сталіна

...олюцыя сходу актыву Менскай організацыі КП(б)Б па дакладу т. Гея аб лісьце т. Сталіна ...эдакцыю часопісу „Пролетарская рэволюцыя“ і задачах барацьбы за партыйнасьць у тэорыі

(Працяг. Пачатак глядзі на 1-й стар.)

...ыў ўпэўнен, што „з боку ...Ясенаўскага, за прызнаньнем суд...ньнем памылак, пасьледуе ...тучая барацьба супроць фальсы...атэўў гісторыі нашай партыі ...става ЦКК УсеКП(б)).

...дынасова актыў адзначае, што ...гістарычных працах тав. Горына ...ецца рад памылак па пытань... : ...б сялянстве і яго ролі ў ...олюцыі 1905 г., аб кіруючай ...і пролетарыяту, аб саветах і ...атоля іншыя памылкі. Гэтыя ...ылкі носяць трацкісцкі і паў...ацкісцкі характар.

...анатуючы, што тав. Горын ...ызнаў свае памылкі, актыў ча...э ад тав. Горына разгорнутай са...крытыкі гэтых памылак.

Ліст тав. Сталіна таксама аба...вязвае яшчэ большай сілай зма...гацца з усялякімі скажэньнямі ...ленінскай нацыянальнай політыкі, ...яшчэ большай сілай узмацніць ...барацьбу з ухіламі ў нацыянальным пытаньні.

...Агульна-гарадзкі сход парт-акты...ву цалкам далучаецца да пастановы ...КП(б)Б і прэзыдыуму ЦКК ...КП(б)Б ад 25-га сьнежня 1931 г. ...аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні.

Менская організацыя—перадавы ...рад КП(б)Б вяла, вядзе і будзе ...весьці непрымірымую барацьбу на ...два фронты—супроць вялікадзяр...жаўнага шовінізму, як галоўнай ...небясьпекай, супроць беларускага ...шовінізму і контр-рэволюцыйнага ...беларускага нацыянал-дэмократызму, ...а таксама супроць шовінізмаў ...рэзных колераў, з гнілым лібэра...лізмам да скажэньня ленінскай ...тэорыі і практыкі ў нацыянальным пытаньні.

...Адзначаючы цэлы рад фактаў, ...выяўленых за апошні час у Мен...скай організацыі, адбіваючых ігно...раваньне нацыянальных асаблівасьцяй, мовы, культуры, быту і нацыянальнай формы з боку часткі апарату і нават комуністых,— партыйны актыў патрабуе ўзмацніць работу па беларусізацыі; пры гэтым парт-актыў падкрэсьлівае правільнасьць пастановы ЦК, якая папярэджвае, „што абмежаваньне задач па беларусізацыі адным толькі вывучэньнем беларускае мовы зьяўляецца недаацэнкай нац-пытаньня і што справа сапраўднага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі заключаецца ў аўладаньні партыйнай організацыяй і рабочаю клясай усімі процэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва (тэорэтычны фронт, літаратура і творчасьць) (пастанова ЦК ад 25-XII-31 г.).

Актыў лічыць патрэбным прапрацаваць пастанову ЦК і ЦКК ад 25-га сьнежня г. г. ва ўсіх партячэйках Менскай організацыі і ў сетцы партасьветы.

Сход партыйнага актыву заклікае ўсю Менскую організацыю КП(б)Б да яшчэ большага павышэньня бальшавіцкай пільнасьці, згуртаваньня партыйных радоў на аснове генеральнай лініі партыі і ўзмацненьня работы па марксысцка-ленінскаму выхаваньню організацыі, асабліва новых папаўненьняў.

Менская організацыя прыходзіць да сваёй 2-ой гарадзкой партыйнай конфэрэнцыі, да XIV-га зьезду КП(б)Б і XVII-й конфэрэнцыі УсеКП(б) монолітнай і згуртаванай на аснове ленінскай лініі партыі, будучы вернай апорай ЦК.

За генэральную лінію партыі!

Супроць правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць „левых“ загібаў і прымірэнцтва да іх!

За рашучае выкрыцьцё і выганяньне контр-рэволюцыйных трацкісцкіх контрабандыстых, за выкрыцьцё і барацьбу з гнілым лібэралізмам, як неабходную ўмову ажыцьцяўленьня 5-ці годкі ў 4 гады, неабходную ўмову далейшага руху наперад!

Н хай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным!

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 25-га сьнежня 1931 г.

Аб політычнай памылцы газэты „Орка“

1. Адзначыць, што рэдакцыя газэты „Орка“ ня толькі ня дала матар'ялаў і артыкулаў па пытаньнях барацьбы з люксэмбургіянствам і трацкісцкай контрабандай, але не перадрукавала прамовы т. Кагановіча. Угледжваючы ў гэтым грубую політычную памылку і ігнараваньне простых указаньняў партыі, прапанаваць рэдакцыі газэты „Орка“ апублікаваць прамову тав. Кагановіча і разгарнуць барацьбу супроць праціўганьня трацкісцкай контрабанды.

2. Абавязаць цэнтральны і раённы друк БССР узмацніць на сваіх старонках барацьбу з выкрыцьцём трацкісцкай контрабанды, з праявамі гнілога лібэралізму, за выкананьне тых задач, якія пастаўлены тав. Сталіным у яго лісьце ў часопіс „Пролетарская революция“.

3. Прыняць да ведама паведамленьне рэдакцыі газэты „Рабсельвор“ аб зьмяшчэньні ў чарговым нумары газэты агляду друку і інш. матар'ялаў па пытаньню задач нізавога друку ў зьвязку з лістом т. Сталіна.

Ал. Новікаў.

...Ня парамі і арцелямі, а ўдарнымі брыгадамі змагацца за лес

(Працяг. Пачатак глядзі ва ўчарашнім нумары)

...Комлексныя, функцыянальныя і скразныя брыгады

...Ёсьць толькі 3 віды брыгад: комплексная, функцыянальная і скразная, але якую-б брыгаду мы ні організоўвалі, яна павінна прадугледжваць цэлы рад момантаў, каб забясьпечыць соцыялістычную сутнасьць працы.

...Брыгады павінны: 1) забясьпечыць выкананьне свайго пляну ў вызначаны тэрмін, 2) падзяленьне працы павінна садзейнічаць павышэньню кваліфікацыі кожнага лесаруба і найбольшай вытворчасьці працы, 3) рацыянальнае выкарыстаньне інструманта: пілы і сякеры, 4) ліквідацыю абязьлічкі ў карыстаньні інструмантамі і механізмамі, 5) соцыялістычную працоўную дысцыпліну і ліквідацыю прагулаў, 6) ...караненьне ўраўнілаўкі ў разьмеркаваньні зарплаты. Гэтыя моманты павінны быць прадугледжаны пры організацыі кожнага віду брыгад. Парушэньне аднаго з пунктаў брыгады парушае соцыялістычны зьмест.

...Комплексная брыгада яднае ў сабе весь комплекс паасобных відаў працы на лесазагатоўках. Брыгада мае спэцыяльных вальшчыкаў, якія толькі займаюцца валкай лесу, абрубшчыкаў сучча, раскражоўшчыкаў, кольшчыкаў і г. д. Кожны лесаруб—брыгаднік ведае толькі сваю працу, спэцыялізуецца на ёй, чым вельмі павышаецца вытворчасьць працы.

Склад брыгады ня можа быць сталым, і залежыць ад таго, якія асортымэнты будзе распрацоўваць брыгада, ад таго, які дрэвастан, калі сасновы—патрэбен адзін абрубшчык сучча калі хваёвы ці лісьцяны—2-3-4, ад таго наколькі густы лес, ад таўшчыні дрэва і г. д.

Пры разьліку колькасьці чал. у брыгадзе трэба выходзіць з адной пары вальшчыкаў, якія забясьпечваюць працу ўсім іншым членам брыгады. Больш адной пары непатрэбна, бо тады брыгада надзвычайна разрастаецца, цяжэй ёю кіраваць, павялічваюцца прастоі.

Найбольш тыповаю формай пабудовы комплекснай брыгады трэба лічыць: а) па будаўнічых лесаматар'ялах: вальшчыкаў—2, абрубшчыкаў сучча (яны-ж і укладчыкі) —2-3 чал., і раскражоўшчыкаў 2-3-4: б) па загатоўцы аднамэтравых дроў: вальшчыкаў 2, абрушчыкаў 2-3, раскражоўшчыкаў 6, кольшчыкаў 1-2, укладчыкаў 3-4.

Пры такім падзеле працы вядучымі профэсыямі зьяўляцца вальшчыкі і раскражоўшчыкі. Яны павінны быць фізычна здаровыя і кваліфікаваныя. Абрубку сучча укладку сучча і дроў, акорку могуць вытвараць падлеткі і жанчыны. Брыгадны мэтод працы дае магчымасьць паставіць спэцыяльнага пілаправа для точкі і разводкі лесарубачных інструмантаў, што значна ўзьнімае вытворчасьць працы. Як паказваюць досьледы Маскоўскага НДІ лясной прамысловасьці, пілу неабходна тачыць пасьля прапілу 45 дрэў, пры таўшчыні ў 30 сантымэтраў, бо пасьля гэтай колькасьці дрэў піла губляе 33 проц. сваёй вытворчай здольнасьці. У мясцох буйнага скапленьня лесарубаў правіць пілы павінен спэцыяльны пілаправ, а пры малай колькасьці рабочых— вопытны рабочы-лесаруб. Пры брыгадным мэтодзе працы кожная катэгорыя рабочых можа ужываць спэцыяльна прыстасаваны да гэтай працы лесарубачны інструмант.

Функцыянальная брыгада організуецца для выкананьня аднаго якога-небудзь процэсу працы (функцыі). Так, могуць быць брыгады выключна вальшчыкаў, раскражоўшчыкаў, акоршчыкаў і г. д.

Пры такім мэтодзе працы павалічваецца нагрузка прыёмшчыка, паколькі прыходзіцца прымаць лесаматар'ял паасобных процэсах: паваленыя, ачышчаны ад сучча і г. д. Ня гледзячы на павялічэньне колькасьці прыёмшчыкаў, такая сыстэма прыёмкі дае наступныя вынікі: прыёмка адбываецца штодзённа, кожны член брыгады ў канцы дня ведае аб колькасьці вытваранай ім працы і заробку, лесарубы пры штодзённым вучоце могуць ужываць вышэйшыя формы соцспаборніцтва і ўдарнцтва.

(Канец будзе)

МЕНСК, ГОМЕЛЬ, СІРОЦІНА, ЖЫТКАВІЧЫ

Выканалі свае абавязкі

У апошнія дні 3 рашаючага комсамол завяршыць выкананьне пляну мобілізацыі сродкаў

Пролетарская грамадзкасьць БССР абавязалася выканаць фінплян 4-га кварталу да адчыненьня сэсіі ЦВК СССР

Выканалі свае абавязкі: Менскі, Гомельскі, Сіроцінскі і Жыткавіцкі раёны. Яны дасягнулі перамогі, разгарнуўшы вялізарную масавую работу, карыстаючыся соцыялістычнымі формамі працы, аб чым яскрава сьведчаць зьмешчаныя матар'ялы.

Сёньня мы зьмяшчаем матар'ял аб вопыце работы менскіх прадпрыемстваў з тым, каб Горацкі, Дрысенскі, Прапойскі і Вушацкі раёны, якія за апошні час пагоршылі сваю работу ў галіне мобілізацыі сродкаў, скарысталі з вопыту перадавых і дабіліся-б перамогі да канца 3-га рашаючага.

Задача зараз у тым, каб ператтварыць іх апошнія дні г. году ў сапраўдныя дні штурму па выкананьню пляна мобілізацыі сродкаў шляхам разгортваньня вялікай масавай работы па вопыту перадавых раёнаў, перадавых прадпрыемстваў.

Буксір „Ударніка“ на абутковай

Рабочыя менскага заводу „Ударнік“—перадавікі фінансавага фронту—узялі на фінансавы буксір Менскую абутковую фабрыку, 35 проц. усіх рабочых якое ня было ахоплена падпіскай на пазыку „3-ці рашаючы“.

Наогул, да апошняга часу, ні камісія садзейнічаньня, ні профорганізацыі нічога не зрабілі для распаўсюджваньня пазыкі, ахопу рабочых ашчадкасамі, страхаваньнем і іншымі крыніцамі мобілізацыі сродкаў.

Буксір „Ударніка“ ўскалыхнуў партыйныя, комсамольскія і профорганізацыі абутковай фабрыкі. У цэху, групе і брыгадзе разгарнулася як новая, так і дадатковая падпіска на пазыку 3-га рашаючага. За 3 дні праведзена падпіска на 700 руб. У закройным цэху застрахавалася 108 чал.

Комсамол фабрыкі сваім асабістым прыкладам у падпісцы на пазыку, уступленьнем ва ўкладчыкі ашчадкасы, страхаваньнем прыцягвае ўсю рабочую масу.

Па ініцыятыве першай комсамольскай ячэйкі машыннага цэху сабрана падпіскі на 1000 руб., застрахаваны дзесяткі рабочых. Комсамольцамі ўнесена ўкладаў у ашчадкасу на 100 руб. 2-я ячэйка машыннага цэху рэалізавала пазыку на суму 600 руб., дала ўкладчыкаў у ашчадкасу на 300 руб. Другая ячэйка швейнага цэху атрымала заданьне сабраць па лініі ашчадкасы 500 руб. і перавыканала яго на 200 руб.

Але гэта першыя крокі працы. Партыйныя і комсамольскія організацыі на гэтым ня спыняюцца, а ўсё больш разгортваюць растлумачальную працу, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць кантрольныя лічбы, высунутыя рабочымі „Ударніка“.

Шафран

Калі мобілізаваны масы

Комсамол менскай фабрыкі „Кастрычнік“ мобілізаваўся на праводзеньне фінэстафэты. На бюро камітэту сумесна з актывам распрацаваны конкрэтны плян ліквідацыі прарываў на фінансавым фронце.

У выніку разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарнцтва мы маем вялікія дасягненьні. 800 рабочых ахоплены колектыўным страхаваньнем, 1550 рабочых зьяўляюцца ўкладчыкамі ў ашчадкасы, 200 рабочых атрымліваюць заробак праз ашчадкасу і 1800 рабочых падпісаліся на пазыку 3-га рашаючага.

Праведзены вечар рабкораў-ударнікаў фінармейцаў сумесна з рабочымі для падвядзеньня вынікаў работы. Рэдакцыя фабрычнай газэты „Кастрычнік“ на вечары прэміявала лепшых ударнікаў фінэстафэты. 5 комсамольцаў прэміяваны ашчаднымі кніжкамі па 40 руб. на кожнага.

Зьлёт рабкораў абвясьціў дэкаднік штурму.

Абвешчана барацьба з чэргамі пры ашчадкасах, усе ўкладчыкі заробак будуць атрымліваць ля варштатаў. Адчынілася бюро давядак па кантролю выйгрышаў облігацый. Паміж стужкамі разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў хутчэйшым выкананьні фінпляну. Фабком вылучыў 3 прэміі найлепшым стужкам.

Штурм забясьпечыў выкананьне абавязкаў, узятых на сабе комсамольцамі.

Шлямбэрг.

У баку ад жыцьця

Асіпавіцкі РК ЛКСМБ яшчэ ня выпрацаваў конкрэтных мерапрыемстваў па ўздзелу комсамольскіх ячэек у мобілізацыі фінсродкаў. Комсамольцы раду ячэек самі не падпісаліся на пазыку і не разгортваюць работ сярод працоўных мас.

РК ЛКСМБ павінен забясьпечыць у гэтай галіне работы тэрміновы пералом.

П. Корзун.

IV пленум ЦК ЛКСМБ

Учора на ранішнім пасяджэньні пачаліся спрэчкі па дакладу тав. ПАЛЯКОВА. У спрэчках выступілі тав. Цярэньцьеў (Талочынскі раён), тав. Грыцько (Аршанскі раён), т. Каганскі (Гомель), Грыневіч (Віцебск), Канопік (Менск), Снапкоў (Магілеў), Дзеравенскі (Бабруйск), Казарэйкіс (Любань), Рутэнбэрг (Ветка), Левін (Віцебск), Фуксон (Слуцк), Лісковіч (Гомель), Кельнік, Жданаў (вайсковы) Хэйман (Менск), Гуткін, Сапега (ЦК ЛКСМБ) і інш.

На вячэрнім пасяджэньні пленуму ў спрэчках на дакладу тав. Палякова выступілі т. т. Дворнікаў (Жлобін), Еўдакімаў (Заслаўе), Пэрліна („Чырв. Зьмена“), Янковіч Каткоў (Менск), Гузікаў (ЦК ЛКСМБ) Русакова (Рагачэў), Шагос (Прапойск), прадстаўнік ЦК УсеЛКСМ т. Косьцін і інш.

Таварышы, якія выступілі ў спрэчках застанаўліваліся на тых посьпехах, якія мае ЛКСМБ, на недахопах нашага кіраўніцтва і работы з актывам, падвергнулі жорсткай крытыцы паасобныя недахопы ў конкрэтным опэрацыйным кіраўніцтве ЦК і РК ЛКСМБ.

Японскія окупацыйныя войскі займаюць новыя раёны

Барацьба за Цзіньчжоў

ШАНХАЙ, 26. Лічачы, што японцы любою панею будуць імкнуцца захапіць Цзіньчжоў, новаабраны цэнтральны выканаўчы камітэт Гоміндаву, ад імя пленуму, які адбываецца ў Нанкіне, патрабаваў, каб Чжан-Сюэ-Ляя аказаў узброенэе супраціўленьне на выпадак атакі японскімі войскамі Цзіньчжоў. Некаторыя ваенныя лідары патрабавалі ад Нанкіна прыняць такія-ж крокі. Ад Фын-Юй-Сяна атрымана тэлеграма, у якой ён патрабуе ахоўваць Цзіньчжоў і вярнуць занятыя японцамі тэрыторыі. Ен-Сі-Шань прапануе паслаць лепшыя войскі для аховы Цзіньчжоў.

* * *

ШАНХАЙ, 26. Сёньня дыплёматычная камісія пры нанкінскім урадзе абмеркавала японскія патрабаваньні прадаставіць рухомы склад для перавозкі войск у Цзяньцзінь. Камісія інструктавала кітайскія ўлады ў Паўночным Кітаі адхіліць японскія патрабаваньні. Адначасова камісія зраб ла прадстаўленьне пасольству ПАЗШ, адзначаючы, што Кітай, адхіліўшы японскія патрабаваньні, не парушае пратаколу 1923 г., але аказвае супраціўленьне карным войскам.

Японскія войскі імкнуцца абкружыць Цзіньчжоў

ШАНХАЙ. 25. Нанкінскім урадам атрымана тэрміновая тэлеграма Юн-Чэня (ваенны губэрнатар Цзіньчжоў), у якой гаворыцца аб крытычным становішчы ў Цзіньчжоў і ўказваецца, што японскія войскі імкнуцца абкружыць Цзіньчжоў.

Сур'ёзныя баі блізу Факумына

БЭЙ ІН. 25. Ваенныя опэрацыі японскай арміі пры ўдзеле кавалерыі артылерыі, бранявых машын і аэропляпаў пачаліся са ўчарашняга дня. Опэрацыі разгортваюцца блізу Факумына. Сур'ёзныя баі ідуць таксама ўздоўж Гоўбенцзы-Іньkоўскай чыгункі. Опэрацыі разглядаюцца як падрыхтоўчыя да агульнага наступу на Цзіньчжоў.

* * *

ТОКІЁ. Агенцтва Сімбун-рэнго паведамляе з Сэўла, што ўчора раніцай „бандыты" напалі на станцыю Фаньвэньчжэнь па Аньдун-Мукдэнскай чыг., разбурылі чыгуначнае палатно і чыгуначны мост. Між „бандытамі" і прыбыўшымі японскімі войскамі адбыўся жорсткі бой. Дарога была ў хуткім часе адноўлена.

* * *

Як паведамляе Сімбун-рэнго з Мукдэна, учора на поўнач ад Цзяньджуаньдая адбылася сутычка між японскімі войскамі і „бандытамі". З абодвух бакоў удзельнічалі броневягнікі.

Дэмонстрацыя рабочых Токіё

ТОКІЁ, 27. Учора Кіошкай (левае профэсыйнае аб'яднаньне) ва ўсіх частках Токіё арганізавала дэмонстрацыю з прычыны адчыненьня парляманту. Як паведамляе друк, дэмонстрацыі адбыліся ва ўсіх раёнах гораду, пад рэволюцыйнымі лёзунгамі супроць парлямэнтарызму, вайны і г. д. Дэмонстрацыі былі разагнаны паліцыяй, якая, па папярэдніх даных, арыштавала 65 рабочых. Газэта „Асахі" паведамляе, што паліцыя арыштавала каля 20 актыўных работнікаў Кіошкаю і організатараў рэволюцыйнага профсаюзу хэмікаў. Сярод арыштаваных бышцам маюцца некалькі кіраўнікоў токійскіх організацый профсаюзу хэмікаў.

Проэкт стварэньня міжнароднай антысавецкай арміі

ПАРЫЖ. Дэпутат Марген (радыкал) унёс у палату дэпутатаў проэкт рэзолюцыі аб стварэньні пад кіраўніцтвам Лігі Нацый міжнароднай узброенай сілы, якая адправілася-б у Кітай з мэтай спыніць грамадзянскую вайну і окупаваць чыгункі ў Кітаі і Манчжурыі. Марген прапануе, каб міжнародная армія, устанавіўшы парадак, дапамагла-б Кітаю стварыць урад, які-б не апасаўся выступленьня кітайскіх генэралаў. Далей прапанова Маргена адзначае, што „гэтым можна будзе ліквідаваць „бандытызм" і „наладзіць распрацоўку горных багацьцяў".

„Юманітэ", у артыкуле, прысьвечаным манчжурскаму конфлікту, піша, што проэкт Маргена адкрыта выказвае „дарагія сэрцу Блюма ідэі аб стварэньні арміі Лігі Нацый". Газэта заяўляе, што пад прапановамі „барацьбы з бандытызмам" захоўваецца плян інтэрвэнцыі супроць кітайскіх саветаў і кітайскай чырвонай арміі. Далей „Юманітэ" падкрэсьлівае, што хоць у проэкце Маргена не ўпамінаецца СССР, аднак прапанова аб окупацыі ўсіх чыгунак Кітаю, а таксама Манчжурыі азначае іншымі словамі, што міжнародны корпус Лігі Нацый зьяўляецца зброяй інтэрвэнцыі супроць СССР.

Чарговая расправа над пасламі Бел. сял.-раб. пасольскага клюбу „Змаганьне"

12 сьнежня 1931 г. адбываўся суд у Вільні над пасламі сойму Беларускага сялянска-работніцкага пасольскага клюбу „Змаганьне".

У час чытаньня прыгавору, якім паслы т. т. Гаўрылік, Дварчанін, Крынчык і Валынец былі асуджаны на 8 год катаргі кожны, у залі суда пасламі была зроблена бурная дэмонстрацыя і кінуты лёзунгі: „Прэч з фашысцкім судом і ўрадам, няхай жыве рэволюцыя!"

За дэмонстрацыю і за абразу суда і ўраду прокурор падаў скаргу ў апэляцыйны суд, які прысудзіў кожнага на паўтара гады катаргі.

На днях адбылася апэляцыя апошняга прыгавару за дэмонстрацыю. Падсудныя на судзе трымаліся горда. Былы пасол т. Крынчык заявіў, што ад фашысцкага суда паслы не чакаюць ні памілаваньня, ні аслабаненьня з астрогу. Ён верыць у тое, што вызваліць іх з фашысцкага астрогу толькі пролетарская рэволюцыя.

Фашысцкі суд пасьля кароткай нарады прыгавар зацьвердзіў.

Хроніка міжнароднага рэволюцыйнага руху

* ТОКІЁ. Сёньня раніцою тысячы беспрацоўных дэмонстравалі патрабуючы работы. Дэмонстрацыя разагнана паліцыяй, арыштаваны рад дэмонстрантаў.

* КАБУЛ. Як паведамляе індыйскі друк, у сувязі з 10-ці проц. зьніжэньнем пэнсіі чыгуначнікам учора ў Могальпуры забаставалі рабочыя вагонных і паравозных майстэрань Паўночна-заходняй чыгункі Індыі. У Нагоры на масавым мітынгу рабочыя Паўночна-заходняй чыгункі прынялі рэзолюцыю протэсту супроць зьніжэньня пэнсіі.

* ПРАГА. Пад уражаньнем крывавай паліцэйскай расправы над рабочымі у Фрэйвальдаў, 70 вядомых дзеячоў навукі і мастацтва выступілі з протэстам супроць лютага тэрору у адносінах рэволюцыйнага руху.

* МАДРЫД. У Віго (провінцыя Понтэводра) рабочыя консэрвных фабрык аб'явілі забастоўку у знак протэсту супроць прымусовага абкладаньня рабочых ўзносамі ў касу страхаваньня мацярынства. Да забастоўкі далучыліся і інш. рабочых. Лік баставаючых дасягае 8 тысяч.

* ЛЁНДАН. Ва ўсіх прамысловых цэнтрах Англіі працягваюцца масавыя выступленьні беспрацоўных. У радзе гарадоў беспрацоўныя дабіліся адмены так званай „проверки нуждаемости" беспрацоўных. На конфэрэнцыі Мастагу (Паўднёвы Уэльс) вылучан „савет дзеяньня» для барацьбы супроць „проверки нуждаемости.»

Вальт

Комсамол Заходняй Беларусі пасьля зьезду

(*Працяг. Пачатак глядзі „Ч. З." № 296 ад 25 сьнежня*)

Вынікі крызісу ўсім сваім цяжарам кладуцца на плечы шырокіх рабоча-сялянскіх мас. Коштам гэтых мас буржуазія імкнецца выйсьці з крызісу. Іяе далейшае наступленьне на зарплату і правы рабочых, узвальваюцца новыя непасільныя падаткі на сялянскую беднату.

Крызіс асабліва моцна б'е па моладзі, удзельная вага якое на прадпрыемствах шпарка ўзрастае. Гэта—вынікі капіталістычнай рацыяналізацыі, якая замяняе кваліфікаваных дарослых рабочых моладзьдзю з мэтай павысіць даходнасьць прыбыткаў. Так, у гутах Зах. Беларусі моладзь складае 55-60 проц., сярод тэкстыльшчыкаў 25-30 проц., у некаторых галінах дробнай прамысловасьці (гарбары, краўцы) моладзь абсалютная большасьць.

Карыстаючыся паганым законам, прадпрымальцы бязьлітасна эксплёатуюць рабочую моладзь. Зарплата—самая ніская. Умовы працы—катаржныя. Капіталістычная рацыяналізацыя выціскае з маладых рабочых усе сілы. Вось што піша аб умовах працы малалетняя работніца фабрыкі „Нёман" у Горадні:

„Мы працуем за апошні час на 3 дні ў тыдзень, плату атрымоўваем нерэгулярна. Акрача таго, у нас на фабрыцы наступае страшэнная эксплёатацыя. Майстры наглядаюць, каб ніхто навят не адварнуўся. Працуем інтэнсыўна і таму за працай часта бываюць усякія няшчасныя выпадкі: машына адсякае пальцы, рукі і г. д. Такія рабочыя назаўсёды выкідаюцца з фабрыкі і на ўсё жыцьцё асуджаны на беспрацоўе і голад, бо не атрымліваюць ніякай дапамогі ад фабрыкантаў і ўраду, які выдае велізарныя грошы на падрыхтоўку вайны супроць СССР."

Беспрацоўная моладзь кінута на галодную сьмерць. Моладзі рабочым і работніцам, „як несамастойным грамадзянам", не выдаецца абсолютна ніякай дапамогі. Моладзь навят не рэгіструюць на біржах працы.

Расьце незадавальненьне, расьце запал рабочай моладзі да барацьбы. Таюць уплывы фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх маладзёжных арганізацый [illegible].

На барацьбу супроць эксплёатацыі, супроць пахавага закону мобілізуе рабочую моладзь КСМ ЗБ, становячыся на чале яе штодзённай барацьбы.

Гэта выносіць рашучы ўдар па правых апортуністах, якія прапаведуюць „тэорыйку" немагчымасьці парамежных забастовак і наступальнай барацьбы пролетарыяту у перыод крызісу.

(Працяг будзе)

Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыя...

Шырэй размах і вышэй якасьц... антырэлігійнай работы

Сьнежаньскі пленум ЦК УсеЛКСМ паставіў бальшавіцкае выхаваньне комсамольцаў у якасьці галоўнейшай задачы дня.

Уключэньне актыўнасьці шматмільённых мас моладзі, уступіўшых у комсамол, у соцыялістычнае будаўніцтва, узброеньне іх бальшавіцкімі традыцыямі, марксысцка-ленінскай тэорыяй, вопытам барацьбы за генэральную лінію партыі, падрыхтоўка з маладых рабочых і колгасьнікаў стойкіх, ідэёва-політычна, тэхнічна і культурна падрыхтаваных будаўнікоў соцыялізму —гэтакая баявая задача дзеяньняў дадзеная пленумам саюзу.

На аснове рашэньняў пленуму павінна быць палепшана і пастаноўка антырэлігійнага выхаваньня моладзі, як неразрыўнай часткі марксысцка-ленінскага, бальшавіцкага выхаваньня. „УсеЛКСМ павінен пасіліць сваю работу па антырэлігійнай пропагандзе, супроць размаітых рэлігійных сэкт, узброіваючы комсамол і моладзь марксысцка-ленінскімі ведамі". (З рэзолюцыі IX зьезду УсеЛКСМ).

Як выконваў комсамол гэтую дырэктыву зьезду? Мы маем зрухі ў антырэлігійнай рабоце ў радзе організацый саюзу.

Некаторыя комсамольскія організацыі змаглі правільна спалучыць антырэлігійную пропаганду з праводзеньнем гаспадарча-політычных кампаній.

Але ў цэлым, становішча з антырэлігійнай работай застаецца яўна нездавальняючым.

Фронт барацьбы з рэлігіяй ёсьць фронт жорсткай і абвастраючайся клясавай барацьбы. Толькі правыя опортуністыя могуць сьцьвярждаць у супярэчнасьці з рэчаіснасьцю аб „мірным" адміраньні рэлігіі, аб „самацёчным" ужываньні рэлігійных забабонаў. Уступленьне СССР у пэрыод соцыялізму, разгорнуты соцыялістычны наступ па ўсім фронце вырывае ўсякі грунт з-пад ног рэлігіі. Клясава-варожыя сілы скарыстоўваюць усе магчымасьці падрыву, затрымкі, тармажэньня тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва. Царкоўнікі і сэктанты ўсіх колераў працягваюць весьці ўпартую барацьбу за моладзь за свой уплыў на яе. Пры гэтым не выпадковай зьяўляецца актывізацыя гэтых кулацкіх „агітпропаў", напрыклад, на новабудоўлях —у мясцох фармаваньня новых кадраў рабочых, там, дзе ўдзельная вага моладзі надзвычайна высокая. На СТЗ баптыстыя організавалі рэлігійна „музычны" гурток з дзвюх чат—сэзоньніц. У тым-жа Сталінградзе быў організаваны гурток „хрыстамола", куды эвангелістыя змаглі прыцягнуць звыш 20 рабочых хлапцоў. У бараках Бобрыкаўскага будаўніцтва арудуюць сэктанты, пераважна спрабуючы распаўсюдзіць уплыў на маладзёжныя казармы. Выяўлен рад сэктанцкіх вылазак, якія ставяць сваёй мэтаю ахоп моладзі на паасобных шахтах Донбасу.

За апошні год у комсамол увайшло каля трох мільёнаў новых членаў з ліку маладых рабочых і колгасьнікаў. Прыход у саюз гэтых велізарнейшых мас патрабуе выключнай увагі да пытаньняў б... шавіцкага выхаваньня новага паўненьня, у прыватнасьці ра... нутай работы па марксысцка-... кай вучобе навічкоў.

Адсюль адна з галоўнейшых ... дач комсамолу на антырэлігі... фронце ў сучасны момант— ахапіць прышоўшую ў комс... трохмільённую масу моладзі, ... ма і ўсю рабоча-колгасную мо... глыбокай, сыстэматычнай анты... гійнай пропагандай, непар... зьвязаўшы яе з барацьбой за ... наньне задач партыі і комс...

Неабходна гэтую пропаганд... ставіць так, каб яна вялася ... выпадку да выпадку, а стала ... ба ахапіць навічкоў актыўнай ... тай у СВБ, адбіваючы ўсякую ... лазку царкоўнікаў і сэктантаў, ... самым загартоўваючы моладз... вучастку барацьбы з рэлігіяй, ... на адным з вучасткаў клясо... барацьбы, выхоўваючы з мал... рабочых і колгасьнікаў непахі... праваднікоў генэральнай лініі ... ты, застрэльшчыкаў новага, бе... лігійнага, соцыялістычнага быт...

Мы маем прыклады, ... лі некаторыя комсамольскія орга... зацыі сумесна з СВБ змаглі ... гарнуць масавую антырэлігій... работу сярод навічкоў. Так, ... самольцы Пай-Арыкскага раёну (... рэдняя Азія) організавалі ў ... сах 49 антырэлігійных гурткоў, ... мацаваўшы да іх для сталай ... ты падрыхтаваных комсамоль... бязбожнікаў, разгарнулі шыро... кампанію па вярбоўцы комсам... цаў і беспартыйнай моладзі ў ... ды саюзу ваяўнічых бязбожні...

Аднак, ці ўсе комсамольскія ... ны могуць пахваліцца гэтакай ... савай работай? У бол... жасьці вы... каў—не. Паранейшаму ў ... мясцох існуе зусім ... недаацэнка антырэлігійнай пра... ганды.

Напрыклад, на Ферганскай ... гельні (Сярэдняя Азія), дырэкт... рам якога быў рэлігійнік (і ў ... нулым—буйны бай), перад абна... ваньнем цэглы печку крапілі ... ініцыятыве дырэктара... крыві жывёлы, прынесенай у ахвяру а... лаху.

Комсамольская ячэйка нічога ... зрабіла, каб спыніць гэты ... шы абсурдны „звычай".

Такіх прыкладаў ліберальна-пр... мірэнчых адносін да выхаваньня р... гійнікаў з боку паасобных комс... мольскіх організацый магчыма пр... весьці ня мала.

Рашучы ўдар па опортуністы... наму ігнараваньню задач і важнас... ці антырэлігійнай пропаганды—... на з важнейшых умоў паспяхова... га разгортваньня марксысцка-лені... скага выхаваньня сярод мільённых мас, што прышлі ў комсамол.

Павышаныя патрабаваньні па... ны быць прад'яўлены зараз і ... Саюза Ваяўнічых Бязбожнікаў. Гэтыя запатрабаваньні формуля... ліся яшчэ IX зьездам УсеЛКСМ (... прамове т. Косарава). Саюзу бя... божнікаў неабходна шпарка пера... будавацца, каб сумесна з комсамо... лам організаваць разгорнутую, глы... бокую антырэлігійную пропаганд... ў масах працоўнай моладзі.

В. Вельмін

Даць па руках кулацкім агентам

Збожжазагатоўкі ў Юравіцкім сельсавеце (Полаччына) праходзяць надзвычайна марудна. Кампанія ня ўвязваецца з такімі важнымі пытаньнямі як організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, размеркаваньне прыбыткаў і інш.

Няма і культмасавай работы вакол гэтай важнейшай задачы. У выніку бязьдзейнасьці сельсавету ў пляне збожжазагатовак зусім нязначныя паказчыкі.

На 18 сьнежня гадавы плян загатовак збожжа абодва сэктары выканалі толькі на 63 проц., і то амаль што за лік колгасаў. Зусім слаба паступае збожжа ад аднаасобнага сэктару, у асаблівасьці ад кулацка-заможных гаспадарак.

Замест прыняць рашучыя меры да кулацка-заможных гаспадарак сельсавет абмежаваўся наступнай офіцыйнай адносінай: „усім кулацка-заможным гаспадаркам. Выканайце дадзеныя вам заданьні хоць на 50 проц., а потым пагледзім. „Такія опортуністычныя, ліберальныя адносіны спрыялі таму, што кулацка-заможныя гаспадаркі і па сёньняшні заданьне ня выканалі.

Мікола Віленскі.

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛІНА

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522